Савіна В.П.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## КАЛЕКТЫЎНА-ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ТВОРЧАСЦЬ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ РЭЖЫСЁРАЎ

Галоўнай асаблівасцю работы рэжысёра ў драматычным тэатры з'яўляецца тое, што працэс фарміравання і ўвасаблення мастацкай задумы будучага спектакля адбываецца ў калектыве. Таму пры падрыхтоўцы спецыялістаў вучэбны працэс трэба мадэляваць так, каб ён у найбольшай ступені набліжаўся да ўмоў калектыўнай рэжысуры, да агульнага ўзаемадзеяння і адначасова да захавання індывідуальнай своеасаблівасці кожнай асобы.

У сувязі з гэтым прапануем распрацаваную намі методыку, якая мае на мэце раскрыццё некаторых шляхоў і ўмоў арганізацыі калектыўнай мастацкай творчасці ў вучэбнай групе пры падрыхтоўцы будучых рэжысёраў.

На адным з заняткаў па рэжысуры абмяркоўвалася экалагічная праблема па матэрыялах дыскусіі «Литературной газеты». Студэнты прыводзілі і свае прыклады з асабістых жыццёвых назіранняў. У працэсе дыскусіі ўзнікла калектыўнае жаданне адказаць на праблемы мастацкімі сродкамі. Гэта першы этап падыходу да задумы.

Праблема аховы навакольнага асяроддзя паслужыла матэрыялам для ўзнікнення эцюда, дзеянне якога адбываецца ў лесе напярэдадні Новага года. Гераіня выбірае самую прыгожую ёлачку і сячэ яе. Радасць надыходзячага свята захапляе дзяўчынку, і пачуццё жалю не ўзнікае ў гледача. Тады мы вырашылі, што неабходна неяк эмацыянальна падкрэсліць пачуццё жалю да дрэўца, больш дакладна пабудаваць кампазіцыю эцюда, вызначыць падзею, яе ацэнку, знайсці адпаведнае эмацыянальнае выражэнне. У працэсе калектыўнага пошуку на рэпетыцыях узнікла такая карціна: ад удара сякеры елка раптам задрыжэла, застагнала, лес, які ўвасабляла група дзяўчат, замер, насцярожыўся. На нашых вачах адкрылася, што ў ёлкі ёсць голас, што яна жывая. І гэта змяніла прапанаваныя абставіны, саму падзею, усю звышзадачу эцюда.

Студэнты не толькі паражылі сам факт адкрыцця, але і сталі яго саўдзельнікамі. Паглыбіўся і змест эцюда. Ужо не дрэва секлі, а яго жывую душу. І зноў былі рэпетыцыі, у выніку якіх паслядоўнасць падзей атрымала далейшае развіццё і абагульненне. Ужо не адна, не дзве ёлкі застагналі, ад сякеры заплакаў увесь лес. Студэнты паступова падышлі да новага псіхалагічнага павароту: цяпер патрабавалася не толькі паспачуваць параненаму дрэву, а і як бы адказаць перад усім лесам, прыродай за свой учынак. Пастановачны пошук прывёў да лагічнага заканчэння эцюда, калі дзяўчына зразумела, што ў дрэва ёсць душа, што гэта яна стогне пад ударам сякеры, а разам з ёй плача і лес. Дзяўчына сваім шалем абматала нанесёную рану. Але каб лес паверыў ёй, гэтага было недастаткова. Трэба было наладзіць свята і для самаго лесу, падыходзіць жа Новы год. У выніку сумеснага абмеркавання было вырашана прыбраць ёлку тут, у лесе. Дзяўчына зняла з сябе рукавіцы, шапачку, упрыгожыла імі, як цацкамі, ёлачку. І тады пачуўся радасны шум лесу. У адказ дзяўчынка ціха сказала: «З Новым годам, лес!»

Так метадам арганізацыі калектыўнай творчасці фарміравалася і ўвасаблялася задума.

Значэнне прапанаванага метаду ў тым, што ўжо сам пошук выражэння задумы адбываецца калектыўна, кожны ўдзельнік выступае ў ролі сатворцы, а не выканаўцы волі рэжысёра, педагога.

Малахава І.А.,
выкладчык

## ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫКАРЫСТАННІ ТЭРМІНА «КРЭАТЫЎНАСЦЬ» У НАВУКОВЫМ УЖЫТКУ

Сутнасць паняцця «крэатыўнасць», якое з'явілася ў навуковым ужытку толькі ў другой палове нашага стагоддзя, на сённяшні дзень дакладна не вызначана (напрыклад, Е.Торэнс налічыў 84 азначэнні крэатыўнасці). Гэта звязана з тым, што даследчыкі прытрымліваюцца розных навуковых накірункаў і самых разнастайных методык і метадалогій.

Аднак нягледзячы на існуючыя адрозненні ва ўсіх выпадках крэатыўнасць разглядаецца як нейкая сутнасць, якая не вычэрпваецца сумай прыкмет, а абумоўлівае змену адносін да гэтых прыкмет, дзе яны пераўтвараюцца з сутнасных характарыстык у паказчыкі нейкай сутнасці. Гэта палажэнне вынікае з даных сучаснай псіхалагічнай навукі, тут асноўны вывад аб звядзенні крэатыўнасці да пераліку асобных уменняў, аб нятоеснасці інтэлекту і ведаў грунтуецца на эксперыментальных доказах. Прычым, калі гаворка заходзіць аб выхаванні крэатыўнасці, маецца на ўвазе развіццё здольнасцей да такіх заняткаў, у выніку якіх будзе атрыманы творчы прадукт (Э.Фром). У гэтым выпадку крэатыўнасць трактуецца як здольнасць да творчага стылю дзейнасці. І сутнасць яе заключаецца не ў простым колькасным назапашванні ведаў, а ва ўменні якасна, па-новаму іх выкарыстоўваць, накіроўваць на атрыманне арыгінальных ідэй і вынікаў (Д.Расел, К.Тэйлар).

Некаторыя даследчыкі, напрыклад В.Лоўнфельд, спрабуюць адрозніваць інтэлект і крэатыўнасць, хоць яны з'яўляюцца аднолькава важнымі і ўзаемазвязанымі аспектамі розуму. Але калі інтэлект — гэта аб'ектыўнае ўспрыманне фактаў, то крэатыўнасць — гэта суб'ектыўны стыль дзейнасці, г.зн. інды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

відуальна афарбаваная работа розуму ў пошуках сутнасных сувязей аналізуемага матэрыялу. Крэатыўнасць ёсць здольнасць свабоднага, арыгінальнага мыслення ў любой сферы, якую выбірае мысліцель.

Такім чынам, пагаджаючыся ў цэлым з прадстаўленай вышэй канцэпцыяй амерыканскіх вучоных, мы лічым, што паняцце «крэатыўнасць» /ад лац. crea - ствараць/ ахоплівае сукупнасць мысліцельных / дывергентнае мысленне, бегласць, гібкасць, арыгінальнасць мыслення, шырыня катэгарызацыі; генералізаваная адчувальнасць праблемы; уменне абстрагавацца, сінтэзаваць, перагрупоўваць ідэі/ і асабовых /уяўленне, фантазія, творчае самаадчуванне/ якасцей /здольнасцей/, якія садзейнічаюць праяўленню і станаўленню творчасці як суб'екцыўнага, індывідуальна афарбаванага прадукта дзейнасці асобы. Супастаўляючы азначэнні творчасці і крэатыўнасці, можна адзначыць, што яны далека не тоесныя.

Калі паняцце «крэатыўнасць» абмежавана спецыфічна псіхалагічнай праблематыкай, а іменна вывучэннем прадуктыўнай разумовай дзейнасці і асаблівасцей функцыянавання асабовых якасцей, то паняцце «творчасць» уключае пытанні, якія выходзяць за межы псіхалагічнай праблематыкі і маюць дачыненне да кампетэнцыі сацыялогіі, эстэтыкі, мастацтвазнаўства і інш. Значыць, крэатыўнасць уяўляецца як універсальная творчая здольнасць да прадуктыўнай дзейнасці і складае «асобны» выпадак творчасці ў шырокім сэнсе як дзейнасці па стварэнню новага, арыгінальнага, раней невядомага.

Структура крэатыўнага патэнцыялу асобы, на наш погляд, уяўляе складанае, шматузроўневае ўтварэнне, у цэнтры якога знаходзіцца крэатыўнасць як агульная універсальная здольнасць да творчасці. У гэтым галоўная сутнасць паняцця «крэатыўнасць». Асноўнымі кампанентамі яе з'яўляюцца: 1/ крытэрыі і паказчыкі /факты/; 2/ перадумовы творчасці як уласцівасці асобы ў цэлым; 3/ тэхналагічная мадэль творчасці.

У навуковай літаратуры вылучаюцца разнастайныя крытэрыі і паказчыкі крэатыўнасці, колькасць якіх дасягае ў некаторых крыніцах 120. Асноўнымі, на наш погляд, крытэрыямі крэатыўнасці як здольнасці да творчасці з'яўляюцца: мысленне /дывергентнае і канвергентнае/; якасныя паказчыкі мысліцельнай дзейнасці /шырыня катэгарызацыі, бегласць, гібкасць, арыгінальнасць/; уяўленне /узнаўляючае і творчае/; творчае самаадчуванне /інтэлектуальнае і эмацыянальнае/; інтэлектуальная ініцыятыва.

Другі кампанент крэатыўнасці, «прадпасылкі творчасці як уласцівасці асобы ў цэлым», уключае наступныя элементы: прыродныя задаткі і індывідуальныя асаблівасці, узроставыя характарыстыкі, узровень сацыяльнага асяроддзя, характаралагічныя асаблівасці, матывы і дысцыпліна творчасці, структура і характар дзейнасці.

Трэці немалаважны кампанент, што ўваходзіць ў структуру крэатыўнасці асобы, вызначаецца як «тэхналогія творчасці» і ўключае творчы прадукт і творчы працэс, якія ў сваю чаргу складаюцца з некалькіх элементаў. Творчы прадукт з'яўляецца вынікам прадуктыўнай дзейнасці асобы і характарызуецца з пункту гледжання якасці, колькасці і сацыяльнай значнасці выніку творчасці. У якасці творчага прадукта могуць выступаць як вынікі работы розуму / думкі, ідэі, лагічныя пабудовы/, так і вынікі практычнай дзейнасці асобы, увасобленыя ў матэрыяльных пабудовах. Творчы працэс уключае ўзроўні /этапы/ творчай дзейнасці асобы.

Такім чынам, сучасная пастаноўка праблемы творчых якасцей, якой прытрымліваемся мы, адрозніваецца перавагай тэзіса аб неабходнасці развіцця крэатыўнасці ва ўсіх людзей, паколькі праяўленне яе носіць універсальны характар. Таму крэатыўнасць неабходна разглядаць як агульную універсальную здольнасць да творчасці, неабходную для любой сферы дзейнасці асобы і маючую складаную шматузроўневую структуру, вывучэнне якой дае магчымасць актывізаваць працэс развіцця творчых якасцей асобы.

Карацееў А.Л.,
канд.мастацтвазнаўства,
дацэнт

## АНСАМБЛІ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ Ў ГІСТОРЫІ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

У гісторыі музычнай культуры Беларусі духавое ансамблевае выкананне мае багатыя традыцыі. Зараджэнне і далейшае развіццё сольнага народнага выканання на духавых інструментах прадвызначылі з'яўленне і больш дасканалай выканальніцкай формы, як выкананне твораў ансамблем духавых інструментаў. На пачатку свайго гістарычнага шляху ансамблі ўключалі толькі народны духавы інструментарый і вызначаліся своеасаблівай манерай выканання, у аснове якой ляжала імправізацыйна-варыяцыйнае развіццё мелодыка-тэматычнай асновы. З'яўленне новай выканальніцкай формы сумеснага музіцыравання з'яўляецца даволі паказальным фактам для нацыянальнай музычнай культуры, бо гэта яшчэ раз падкрэслівае шматграннасць эвалюцыі духавога выканання на Беларусі ўвогуле.

Адзначым, што ў рамках мастацкай культуры, у прыватнасці музычнага мастацтва, фарміраванне і развіццё духавога ансамблевага выканання насілі самастойны характар, дазваляці розным ансамблевым саставам дэманстраваць свае мастацкія дасягненні. Дзякуючы дынамічнаму выканальніцкаму працэсу ансамблевае музіцыраванне стала афармляцца структурна за кошт развіцця ўласных асноўных напрамкаў: 1) народнае духавое ансамблевае музіцыраванне; 2) прафесійнае ансамблевае выкананне; 3) аматарскае

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ